# гэта можна зрабіць

**Выбарчая праграма спісу «Наступ» на выбарах у Каардынацыйную Раду IV склікання**

**2026-2028 гг.**

Для нас Каардынацыйная Рада — гэта пляцоўка, праз якую можна змяняць стратэгію дэмакратычных сіл, калі даць ёй рэальныя паўнамоцтвы і адказнасць.

Нас выбіраюць тыя, хто стаміўся жыць у рэжыме вечнай эміграцыі і хоча мець магчымасць бяспечна вярнуцца дадому. Мы гаворым з тымі, хто разумее, што аднымі прыгожымі словамі пра дэмакратыю і санкцыямі «да канца» рэжым не зламаць і дадому не вярнуцца.

Офіс, Кабінет і большасць Каардынацыйнай Рады афіцыйна дэкларуюць тыя ж мэты, што і мы: свабода палітвязняў, незалежная Беларусь, вяртанне. Але за 5 гадоў кантэкст моцна змяніўся.

- Заходняя павестка перагружана вайной і іншымі крызісамі;
- беларускае пытанне сышло з першых палос;
- санкцыі даведзены да ўзроўню, супастаўнага з жорсткімі рэжымамі супраць іншых аўтарытарных краін, але гэта не прывяло ні да змякчэння рэпрэсій, ні да развароту знешняй палітыкі Мінска, а паглыбіла яго залежнасць ад Масквы;
- з’явіліся першыя адкрытыя і схаваныя «здзелкі»: вызваленне партый палітвязняў у абмен на частковае змякчэнне санкцый і нармалізацыю кантактаў з Захадам.

А базавая стратэгія дэмсіл засталася амаль такой жа, як у 2020: больш санкцый, больш рэзалюцый, больш новых інстытутаў у выгнанні.

Наступ створаны як адказ на гэтую стратэгічную інерцыю.

Мы ня супраць Офіса, Кабінета або КР як такіх. Мы супраць таго, каб гадамі паўтараць адны і тыя ж рытуалы і пры гэтым чакаць іншага выніку; не адаптаваць стратэгію пад новую рэальнасць; мы гатовыя працаваць разам там, дзе ёсць шанец на вынік, і казаць шчыра, калі стратэгія не працуе.

# I. Галоўная мэта

Наша галоўная мэта: вяртанне беларусам і беларускам іх правоў, у тым ліку права жыць у сябе дома, спакойна атрымліваць дакументы і ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны.

Любая дзейнасць за межамі Беларусі мае сэнс толькі калі яна:

- спрыяе вызваленню людзей і зніжэнню «цаны» рэпрэсій для грамадства;
- рэальна аслабляе магчымасці рэпрэсіўнай сістэмы;
- змяншае залежнасць Беларусі ад Расіі;
- набліжае трансфармацыю рэжыму і стварае для ключавых актараў сітуацыю, у якой дамоўлены пераход да новай канфігурацыі ўлады рацыянальнейшы за працяг статуса-кво.

# II. Санкцыі як інструмент, а не самамэта

Наступ супраць санкцый дзеля санкцый.

Санкцыі, якія не ўбудаваны ў стратэгію гандлю і пераходу, абслугоўваюць у першую чаргу сімвалічную павестку лідараў у эміграцыі і прапаганду рэжыму, а не інтарэсы беларускіх грамадзян.

Нашы прынцыпы па санкцыях:

- Санкцыі патрэбныя, але толькі як частка выразнай палітычнай здзелкі: кожнае ўзмацненне і кожнае змякчэнне павінны быць прывязаны да канкрэтных, правяральных крокаў рэжыму (вызваленне людзей, змяненне законаў, допуск міжнародных механізмаў і г.д.).
- Мы падтрымліваем персанальныя і кропкавыя санкцыі супраць тых, хто прымае рашэнні аб рэпрэсіях і ўцягванні Беларусі ў вайну, але выступаем супраць пашырэння сектаральных санкцый без яснага палітычнага зместу здзелкі.
- Мы лічым памылкай аўтаматычна патрабаваць «яшчэ санкцый» пасля кожнага кроку рэжыму, не прапаноўваючы партнёрам зразумелай дарожнай карты, як праз гэтыя санкцыі прыйсці да перамоўнай пазіцыі і пераходу.

Ужо цяпер частка вызваленняў палітвязняў і змяненняў у кантактах Захаду з Мінскам адбываюцца ў фармаце «санкцыі ў абмен на людзей».

Наш падыход: не хаваць гэта, а дамагацца празрыстых, максімальна кантраляваных грамадствам і партнёрамі здзелак. Для нас важныя зразумеласць цаны і выніку, а не афармленне іх як кулуарных выключэнняў.

# III. Дыялог як палітычны інструмент

Наступ лічыць неабходнымі перамовы з прадстаўнікамі рэжыму пры выкананні выразных умоў.

Дыялог не азначае прызнанне легітымнасці. Ён азначае выкарыстанне ўсіх каналаў, каб вызваліць несправядліва асуджаных людзей з турмаў, знізіць узровень рэпрэсій і крок за крокам падводзіць сістэму да пераходу.

Нашы базавыя пазіцыі:

- Рэжым рэагуе толькі на камбінацыю ціску, стымулаў і перамоў; ізаляцыя без камунікацыі не вызваляе людзей і не змяняе сітуацыю ў лепшы бок.
- Зараз рэжым не зацікаўлены ў сур’ёзных перамовах аб трансфармацыі, але гэта не падстава адмаўляцца ад падрыхтоўкі да іх: патрэбныя сцэнары, павесткі, патэнцыйныя пасрэднікі і разуменне, якія «пакеты» наогул можна абмяркоўваць.
- Любыя кантакты павінны будавацца вакол канкрэтнай павесткі: вызваленне людзей, змякчэнне рэпрэсій, вяртанне міжнародных місій і г.д.

Мы не прапануем амністыю ўсім і адразу. Мы прызнаём, што частка эліт і сілавікоў можа атрымаць абмежаваныя гарантыі ў абмен на адмову ад удзелу ў гвалце і падтрымку пераходу. Пытанне ў тым, хто, за што і на якіх умовах, і гэта нельга выносіць за дужкі размовы.

# IV.

# Палітычныя зняволеныя

Вызваленне палітычных зняволеных — цэнтральны прыярытэт.

Любая стратэгія, у якой лёс людзей у турмах — пабочны эфект «вялікай палітыкі», для нас непрымальная.

Наш падыход:

- выкарыстоўваць санкцыі і міжнародны ціск менавіта як інструмент перамоў аб вызваленні людзей, а не як самастойную каштоўнасць;
- дамагацца паэтапных пакетаў вызваленняў, у тым ліку з часовымі і частковымі змякчэннямі санкцый, калі гэта дае рэальную, адэкватную адносна сродкаў вымяральную колькасць людзей на волі;
- прыцягваць міжнародных пасрэднікаў і інстытуцыі для фіксацыі абавязацельстваў рэжыму і маніторынгу іх выканання, каб мінімізаваць рызыку падману і паўторных пасадак.

«Людзі за санкцыі» — маральна нязручная, але палітычна рэальная формула.

Рашэнне аб кожным такім павінна прымацца свядома, з удзелам прадстаўнікоў супольнасцяў палітвязняў і з максімальнай празрыстасцю перад грамадствам, а не ў фармаце асабістых піяр-здзелак лідараў.

# V. Беларуская дыяспара як палітычная сіла

Сотні тысяч беларусаў былі вымушаны з’ехаць; дзясяткі тысяч людзей праходзяць складаныя і доўгія працэдуры легалізацыі і сутыкаюцца з прававой нестабільнасцю.

Клопат пра іх — частка палітычнай адказнасці за 2020 год і наступныя падзеі.

Нашы задачы:

- абарона інтарэсаў дыяспары ў краінах знаходжання — ад міграцыйнага статусу да доступу да рынку працы і сацыяльнай абароны;
- дапамога ў вырашэнні практычных пытанняў: легалізацыя, прызнанне дакументаў і адукацыі, абарона ад дыскрымінацыі па пашпарце, медыцынская і сацыяльная падтрымка рэпрэсаваных і іх сем’яў;
- ўцягванне дыяспары ў прыняцце рашэнняў: удзел у выбарах КР, кантроль за дэлегатамі, уплыў на стратэгію Офіса і Кабінета праз празрыстыя механізмы.

Мы разглядаем дыяспару як палітычную сілу, а не як масоўку для мітынгаў і крыніцу ахвяраванняў.

Наступ будзе дамагацца, каб кожны буйны крок дэмакратычных структур, якія датычыцца санкцый, здзелак або дыялогу, абмяркоўваўся з дыяспарай і тлумачыўся ёй.

# VI. Польшча і іншыя краіны знаходжання

Польшча — галоўны цэнтр беларускага выгнання і ключавы партнёр, ад палітыкі якога залежыць бяспека і якасць жыцця дзясяткаў тысяч нашых людзей.

Таксама прыярытэтныя Літва, Германія, Чэхія, Латвія і Украіна як краіны, дзе сфармаваліся значныя беларускія супольнасці.

Мы дамагаемся:

- спецыяльных прававых рэжымаў для беларусаў (гуманітарныя і палітычныя статусы, спрошчаныя ВНЖ для рэпрэсаваных і іх сем’яў);
- спрошчаных працэдур легалізацыі і доступу да рынку працы, скарачэння тэрмінаў разгляду спраў і лічбавізацыі працэдур, каб людзі маглі планаваць жыццё, а не жыць у гадавым падвешаным статусе;
- абароны ад прымусовага вяртання ў Беларусь і ўліку рызыкі рэпрэсій пры любых рашэннях па дэпартацыях і экстрадыцыях;
- стварэння стабільных умоў для бізнесу і самазанятасці беларусаў, уключаючы доступ да рахункаў, ліцэнзій, магчымасцяў вядзення бізнесу ў ЕС;
- паляпшэння візавай і памежнай сітуацыі: пашырэнне гуманітарных візавых рэжымаў, спрашчэнне паездак для сем’яў, вучобы і працы, каб пашпарт не ператвараўся ў кляймо.

Мы гаворым з дзяржавамі не толькі як «ахвяры рэжыму», але і як партнёры: беларуская дыяспара ўносіць уклад у эканоміку і грамадства краін знаходжання, і наша задача — зрабіць гэты ўклад бачным і палітычна канвертуемым.

# VII. Экономіка, праца і капітал

Без нармальнай эканомікі не будзе масавага вяртання.

Людзі не паедуць назад туды, дзе іх чакаюць толькі беднасць, самавольства і адсутнасць перспектыў.

У эміграцыі Наступ выступае за:

- абарону беларускіх прадпрымальнікаў і самазанятых ад дадатковых бар'ераў, звязаных з грамадзянствам;
- падтрымку беларускіх бізнесаў, якія ствараюць працоўныя месцы для нашых людзей і дапамагаюць утрымліваць чалавечы капітал;
- мінімізацыю бюракратычных перашкод для працы ІП, фрылансераў і малога бізнесу — ад адкрыцця рахункаў да падаткаабкладання.

Для будучай Беларусі мы прасоўваем базавыя прынцыпы:

- абарона прыватнай уласнасці і рынкавая логіка як аснова аднаўлення краіны пасля аўтарытарызму;
- дэпалітызацыя бізнесу — канец практыцы, калі лаяльнасць рэжыму важней за закон і эканамічны сэнс;
- інтэграцыя ў еўрапейскія рынкі як спосаб знізіць залежнасць ад аднаго знешняга цэнтра сілы.

Падрабязныя эканамічныя рэформы — тэма асобнага дакумента, але напрамак для выбаршчыка зразумелы: «мы за тое, каб было куды вяртацца працаваць і будаваць».

# VIII. Адукацыя і кадры

Беларусь губляе людзей не толькі з-за рэпрэсій, але і з-за адсутнасці перспектыў унутры краіны. Дыяспара фарміруе новы слой спецыялістаў, якія ўжо працуюць і вучацца ў Польшчы, Літве, Германіі і іншых краінах.

Наступ падтрымлівае:

- пашырэнне доступу беларусаў да вышэйшай і прафесійнай адукацыі ў краінах знаходжання праз стыпендыі, квоты і спецыяльныя праграмы;
- прызнанне беларускіх дыпломаў і кваліфікацый, а там, дзе гэта немагчыма — стварэнне рэалістычных працэдур перапацвярджэння без дыскрымінацыі па пашпарце.

Наша задача — не страціць гэта пакаленне канчаткова. Адукаваныя, інтэграваныя беларусы павінны мець магчымасць і жыць годна ў ЕС цяпер, не губляючы веры і сувязі з Беларуссю, і пры жаданні бяспечна вяртацца ў Беларусь.

# IX. Рэформа Каарды-нацыйнай Рады

Каардынацыйная Рада павінна альбо змяніцца, альбо перастаць выконваць ролю, якую імітуе. Зараз пры ўсёй міжнароднай бачнасці КР застаецца структурай з абмежаваным уплывам на стратэгію дэмсіл і нізкай уцягнутасцю нават сярод саміх дэлегатаў.

Ключавыя праблемы:

- няма рэальных рэсурсаў уздзеяння на рашэнні Офіса, Кабінета і іншых структур;
- адсутнічае механізм маніторынгу выканання рэкамендацый КР і адказнасці за ігнараванне гэтых рашэнняў;
- няма інструмента папярэдняга ўзгаднення стратэгіі: кожны цэнтр прымае свае рашэнні, а «каардынацыя» існуе ў асноўным на словах.

Наступ выступае за:

- выразныя паўнамоцтвы КР: права папярэдняга разгляду і ацэнкі ключавых стратэгічных рашэнняў дэмсіл: санкцыйныя ініцыятывы, перамоўныя фарматы, буйныя міжнародныя кампаніі;
- празрыстыя працэдуры прыняцця рашэнняў і публікацыю адкрытых вынікаў паіменных галасаванняў па прынцыповых пытаннях;
- увядзенне механізмаў палітычнай адказнасці дэлегатаў, напрыклад, рэгулярных справаздач;
- інстытуцыяналізацыю ролі КР як месца, дзе не толькі спрачаюцца, але і ўзгадняюць стратэгію: без гэтага «каардынацыйная» застаецца толькі ў назве.

Мы гатовыя працаваць унутры існуючых структур і разам з Офісам і Кабінетам там, дзе гэта дае шанец на вынік.

Аднак Наступ не будзе падыгрываць логіцы «адзінства любой цаной», калі яна азначае забарону на сумленную размову пра правальныя стратэгіі і адмову ад іх паразборкі.